Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб’яднанне
па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

# БІБЛІЯГРАФАЗНАЎСТВА. Раздзел 1. ТЭОРЫЯ

*Тыпавая вучэбная праграма
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць
(па напрамках)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2017

**СКЛАДАЛЬНІК**
*Т. В. Кузьмініч,* дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*вучоны* савет дзяржаўнай установы «Нацыянальная бібліятэка Беларусі»;
*Т. В. Баранава,* намеснік дырэктара па бібліятэчнай рабоце дзяржаўнай установы «Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна», магістр педагагічных навук

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ТЫПАВОЙ:**
*кафедрай* тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 7 ад 19.02.2016 г.);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 3 ад 15.03.2016 г.);
*навукова-метадычным* саветам па бібліятэказнаўстве і бібліяграфіі вучэбна-метадычнага аб'яднання па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў (пратакол № 2 ад 22.03.2016 г.)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: Т. В. Кузьмініч

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Тыпавая вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Бібліяграфазнаўства» распрацавана для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі I ступені па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках). Вучэбная дысцыпліна «Бібліяграфазнаўства» складаецца з двух раздзелаў: «Тэорыя» і «Гісторыя». Дадзеная праграма прызначана для вывучэння першага раздзела «Тэорыя».

Актуальнасць вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Бібліяграфазнаўства. Раздзел 1. Тэорыя» абумоўлена фундаментальнай роляй тэарэтыка-бібліяграфічных ведаў у фарміраванні прафесіянальнага светапогляду студэнтаў, здольнасцей аналізаваць і абагульняць розныя бібліяграфічныя з’явы, уменняў прагназаваць як бібліяграфічную дзейнасць у цэлым, так і асобныя яе кірункі.

Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны «Бібліяграфазнаўства. Раздзел 1. Тэорыя» студэнты выкарыстоўваюць веды і ўменні, сфарміраваныя ў працэсе засваення вучэбных дысцыплін «Бібліятэказнаўства. Раздзел 2. Тэорыя», «Дакументалогія», «Тэорыя інфармацыі і камунікацыі», а таксама дысцыплін цыкла агульнанавуковых і агульнапрафесійных дысцыплін (псіхалогіі, педагогікі і інш.).

*Мэтай* вучэбнай дысцыпліны «Бібліяграфазнаўства. Раздзел 1. Тэорыя» з’яўляецца фарміраванне прафесійнай кампетэнтнасці спецыялістаў, скіраванае на засваенне студэнтамі тэарэтычных асноў бібліяграфіі як грамадскай з’явы і сістэмы відаў чалавечай дзейнасці, якія забяспечваюць стварэнне і рух бібліяграфічных ведаў у сусветнай інфармацыйнай прасторы, а таксама здольнасцей прымяняць атрыманыя тэарэтычныя веды ў бібліяграфічнай практычнай дзейнасці.

Вучэбная дысцыпліна «Бібліяграфазнаўства. Раздзел 1. Тэорыя» абапіраецца на законы і катэгорыі філасофіі, тэорыі інфармацыі і сацыяльных камунікацый, бібліятэказнаўства, дакументалогіі.

*Задачамі* гэтага раздзела з’яўляюцца:

– асэнсаванне бібліяграфіі як грамадскай з’явы і спецыфікі бібліяграфічнай інфармацыі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– раскрыццё ўнутраных і знешніх фактараў, якія ўздзейнічаюць на фарміраванне і спецыфіку бібліяграфічнай прадукцыі;

– асэнсаванне асноўных сучасных тэарэтычных поглядаў на бібліяграфію і яе месца ў сістэме відаў чалавечай дзейнасці;

– характарыстыка паняційнага апарату сучаснага бібліяграфазнаўства і кірункі яго прымянення ў практычнай бібліяграфічнай дзейнасці.

У адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту студэнт павінен *ведаць:*

– тэарэтычныя ўяўленні аб бібліяграфіі, асноўныя паняцці бібліяграфазнаўства;

– кампанентную структуру бібліяграфічнай практычнай дзейнасці;

– відавую структуру бібліяграфіі і бібліяграфічнай прадукцыі;

– аспектную і аб’ектную структуру бібліяграфазнаўства;

– сістэму метадаў бібліяграфазнаўства;

*умець:*

– выкарыстоўваць тэарэтычныя веды ў прафесійнай практычнай і навуковай дзейнасці;

– аналізаваць і сістэматызаваць бібліяграфічную прадукцыю для класіфікацыі па формах, тыпах, жанрах, відах;

– выкарыстоўваць вядомыя факты пры разглядзе прычынна-выніковых сувязей тэорыі бібліяграфіі;

*валодаць:*

– тэрмінамі і паняццямі, якія склаліся ў бібліяграфазнаўстве;

– методыкай стварэння і ўспрымання разнастайных бібліяграфічных паведамленняў;

– метадамі аналізу, ацэнкі і вызначэння перспектыў развіцця бібліяграфіі ў грамадстве;

– уяўленнямі аб патэнцыяле бібліяграфазнаўства як дысцыпліны сацыягуманітарнага комплексу.

Засваенне вучэбнай дысцыпліны «Бібліяграфазнаўства. Раздзел 1. Тэорыя» для спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках) павінна забяспечыць фарміраванне наступных кампетэнцый.

**Акадэмічныя кампетэнцыі:** АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і творчых задач; АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам; АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі; АК-4. Умець

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

працаваць самастойна; АК-5. Быць здольным параджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю); АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем; АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі; АК-9. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця; АК-10. Валодаць метадычнымі ведамі і даследчымі ўменнямі, якія забяспечваюць вырашэнне задач інавацыйна-метадычнай і навукова-даследчай дзейнасці ў галіне бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці.

**Сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:** САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння; САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый; САК-5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі; САК-6. Умець працаваць у камандзе; САК-7. Быць здольным асэнсавана ўспрымаць і беражліва адносіцца да гістарычнай, культурнай спадчыны Беларусі і свету, культурных традыцый і рэлігійных поглядаў.

**Прафесійныя кампетэнцыі:** ПК-1. Выконваць бібліятэчна-інфармацыйныя тэхналагічныя працэсы ў асяроддзі сучасных АБІС; ПК-2. Фарміраваць бібліятэчны фонд з улікам выкарыстання разнастайных крыніц і сродкаў яго камплектавання, асаблівасцей уліку і апрацоўкі, размяшчэння, расстаноўкі і захавання; ПК-3. Ажыццяўляць каталагізацыю дакументаў і падтрымку электроннага каталога; ПК-4. Весці інфармацыйна-бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў розных сфер дзейнасці; ПК-5. Весці бібліятэчнае абслугоўванне розных груп карыстальнікаў; ПК-6. Ажыццяўляць традыцыйную і электронную выдачу і дастаўку дакументаў; ПК-7. Фарміраваць інфармацыйную культуру карыстальнікаў; ПК-12. Вывучаць, аналізаваць і ўкараняць сусветны вопыт інавацыйнай дзейнасці бібліятэк і інфармацыйных цэнтраў; ПК-13. Аказваць кансалтынгавую дапамогу па разнастайных кірунках бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці; ПК-14. Распрацоўваць метадычныя матэрыялы і рэкамендацыі, арганізацыйна-тэхналагічную дакументацыю; ПК-15. Выкарыстоўваць сучасныя дасягненні навукі і перадавых тэхналогій і ўкараняць іх у практычную дзейнасць; ПК-16. Выкарыстоўваць метады навуковых даследаванняў у бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці; ПК-17. Арганізоўваць і праводзіць навуковыя даследаванні; вывучаць эфектыўнасць бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці; ПК-18. Выконваць патрабаванні заканадаўчых і нарматыўна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прававых дакументаў у галіне бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці; ПК-24. Выкарыстоўваць інструментарый тэхналагічнага бібліятэчнага менеджменту; ПК-37. Арганізоўваць і суправаджаць павышэнне кваліфікацыі супрацоўнікаў бібліятэк.

У адпаведнасці з адукацыйным стандартам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Бібліяграфазнаўства» для спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках) усяго прадугледжана 194 гадзіны, з іх 120 – аўдыторныя заняткі. На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Бібліяграфазнаўства. Раздзел 1. Тэорыя» ўсяго адведзена 80 гадзін, з якіх 50 – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 26 гадзін, семінары – 14 гадзін, практычныя заняткі – 10 гадзін. Рэкамендаванай формай выніковага кантролю ведаў студэнтаў з’яўляецца экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|
| | усяго | лекц. | сем. | практ. |
| Уводзіны | 1 | 1 | | |
| **Раздзел I. Бібліяграфія як грамадская з’ява** | | | | |
| *Тэма 1.* Бібліяграфія ў інфармацыйнай інфраструктуры грамадства | 3 | 1 | 2 | |
| *Тэма 2.* Бібліяграфічная інфармацыя і бібліяграфічныя веды ў тэрмінасістэме бібліяграфазнаўства | 2 | 2 | | |
| *Тэма 3.* Функцыянальная структура бібліяграфіі | 4 | 2 | 2 | |
| *Тэма 4.* Прынцыпы і заканамернасці развіцця бібліяграфіі | 3 | 1 | 2 | |
| *Тэма 5.* Бібліяграфічная прадукцыя: сучасныя формы, жанры і віды | 13 | 3 | | 10 |
| **Раздзел II. Бібліяграфічная дзейнасць** | | | | |
| *Тэма 6.* Бібліяграфічная практыка і пазнанне | 2 | 2 | | |
| *Тэма 7.* Кампанентная структура бібліяграфічнай практычнай дзейнасці | 6 | 4 | 2 | |
| *Тэма 8.* Відавая структура бібліяграфіі | 4 | 2 | 2 | |
| *Тэма 9.* Каталожная і нацыянальная бібліяграфія як прыярытэтныя кірункі развіцця бібліяграфіі на сучасным этапе | 4 | 2 | 2 | |
| **Раздзел III. Бібліяграфазнаўства як сістэма навуковых ведаў** | | | | |
| *Тэма 10.* Структура, змест і метады бібліяграфазнаўства | 3 | 3 | | |
| *Тэма 11.* Развіццё бібліяграфазнаўства на сучасным этапе | 5 | 3 | 2 | |
| **Разам…** | **50** | **26** | **14** | **10** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны*

«Бібліяграфазнаўства. Тэорыя» як навуковая і вучэбная дысцыпліна. Задачы і змест вучэбнай дысцыпліны. Яе месца ў сістэме прафесійнай падрыхтоўкі бібліятэкараў-бібліёграфаў. «Бібліяграфазнаўства. Тэорыя» ў вучэбным цыкле бібліяграфічных вучэбных дысцыплін. Фундаментальны характар тэорыі бібліяграфіі ў адносінах да іншых бібліяграфічных дысцыплін. Сувязь вучэбнай дысцыпліны «Бібліяграфазнаўства. Тэорыя» з вучэбнымі дысцыплінамі: «Гісторыя кнігі», «Дакументалогія», «Бібліятэказнаўства. Тэорыя», «Тэорыя інфармацыі і камунікацыі» і інш.

Характарыстыка асноўнай вучэбнай, вучэбна-метадычнай, нарматыўнай, даведачнай літаратуры, спецыяльных часопісаў у дапамогу засваенню вучэбнай дысцыпліны. Асноўныя формы аўдыторнай і пазааўдыторнай работы пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны. Асноўныя формы кантролю: бягучыя, прамежкавыя і выніковыя.

## Раздзел I. Бібліяграфія як грамадская з’ява

### *Тэма 1. Бібліяграфія ў інфармацыйнай інфраструктуры грамадства*

Паняцце «бібліяграфія», яго этымалогія і генезіс. Шматзначнасць сучаснага выкарыстання тэрміна «бібліяграфія».

Заканамернасць узнікнення бібліяграфічных звестак як неад’емнай часткі дакумента. Афінныя і латэнтныя формы бібліяграфіі. Грамадскія патрэбнасці ў інфармацыі, ведах як важнейшая перадумова функцыянавання бібліяграфіі як грамадскай з’явы.

Паняцце аб метасістэме існавання бібліяграфіі як грамадскай з’явы. Сістэма дакументальных камунікацый як метасістэма існавання бібліяграфіі як грамадскай з’явы. Асноўныя элементы і іх характарыстыка. Інфармацыйныя бар’еры паміж дакументаванай інфармацыяй і карыстальнікамі. Роля бібліяграфіі ў іх пераадоленні (дакументаграфічная канцэпцыя).

Свет тэкставых камунікацый як метасістэма існавання бібліяграфіі (кагнітаграфічная канцэпцыя). Асноўныя элементы і іх характарыстыка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Універсум чалавечай дзейнасці як метасістэма існавання бібліяграфіі (ідэаграфічная канцэпцыя). Асноўныя элементы і іх характарыстыка.

Уздзеянне на бібліяграфію гісторыка-культурных, сацыяльна-эканамічных, тэхналагічных фактараў, умоў развіцця грамадства.

*Тэма 2. Бібліяграфічная інфармацыя і бібліяграфічныя веды ў тэрмінасістэме бібліяграфазнаўства*

Бібліяграфічная інфармацыя як разнавіднасць сацыяльнай інфармацыі і як крытэрый адмежавання бібліяграфічных з'яў ад небібліяграфічных.

З'яўленне паняцця «бібліяграфічная інфармацыя» ў тэрмінасістэме кнігазнаўства, бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства. Развіццё тэарэтычных поглядаў на аб'ём паняцця «бібліяграфічная інфармацыя».

Разуменне сутнасці бібліяграфічнай інфармацыі як інфармацыі другаснай, адасобленай ад дакумента згодна дакументаграфічнай канцэпцыі бібліяграфіі.

Непарыўная сувязь бібліяграфічнай інфармацыі з тэкстам і адчужанасць ад яго. Прагнозная, латэнтная, афінная, постэдзіцыйная бібліяграфічная інфармацыя.

Бібліяграфічныя веды як сродак пазнання, камунікацыі, каштоўнаснай арыентацыі, рэгулявання і кіравання (кагнітаграфічная канцэпцыя бібліяграфіі). Структура бібліяграфічных ведаў. Суадносіны паняццяў «бібліяграфічная інфармацыя» і «бібліяграфічныя веды».

Асноўныя ўласцівасці бібліяграфічнай інфармацыі (бібліяграфічных ведаў).

*Тэма 3. Функцыянальная структура бібліяграфіі*

Функцыянальнае прызначэнне бібліяграфіі як выяўленне мэт бібліяграфічнай дзейнасці. Функцыянальная «дапаможнасць» і «самастойнасць» бібліяграфіі (бібліяграфічнай інфармацыі) як грамадскай з'явы.

Знешнія і ўнутраныя (сутнасныя) функцыі бібліяграфічнай інфармацыі.

Функцыянальная структура бібліяграфіі згодна дакументаграфічнай канцэпцыі. Двaістасць бібліяграфічнай інфармацыі як адлюстраванне двaістасці адносін «дакумент – спажывец

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыі». Механізм фарміравання бібліяграфічных патрэбнасцей і іх структура. Асноўныя грамадскія функцыі бібліяграфіі. Генетычная і лагічная функцыянальныя структуры бібліяграфічнай інфармацыі і бібліяграфіі як грамадскай з’явы.

Функцыянальная структура бібліяграфіі згодна кагнітаграфічнай канцэпцыі. Бібліяграфічныя веды як сродак пазнання фіксаваных тэкстаў і бібліяграфічных патрэбнасцей карыстальнікаў. Бібліяграфічныя веды як сродак тэкставай камунікацыі, каштоўнаснай арыентацыі, рэгулявання і кіравання.

Функцыянальная структура бібліяграфіі згодна ідэаграфічнай канцэпцыі. Бібліяграфічная інфармацыя як сродак аперыравання суверэннымі інфааб’ектамі.

*Тэма 4. Прынцыпы і заканамернасці развіцця бібліяграфіі*

Прынцыпы і заканамернасці бібліяграфічнай дзейнасці як аснова яе ўвасаблення ў грамадскай практыцы. Прынцыпы метадалагічнага характару. Прынцыпы тэхналагічнага характару. Заканамернасці бібліяграфічнай дзейнасці.

*Тэма 5. Бібліяграфічная прадукцыя:*
*сучасныя формы, жанры і віды*

Бібліяграфічнае паведамленне. Асноўныя формы, структура і прызначэнне бібліяграфічнага паведамлення. Бібліяграфічны запіс як фіксаваная форма існавання бібліяграфічнага паведамлення і структурная адзінка любога бібліяграфічнага дапаможніка. Структура бібліяграфічнага запісу.

Бібліяграфічны дапаможнік як асноўны спосаб існавання і сродак распаўсюджвання дакументаванай бібліяграфічнай інфармацыі. Паняцці «бібліяграфічны дапаможнік», «бібліяграфічны дакумент», «бібліяграфічны рэсурс», «бібліяграфічны прадукт».

Формы існавання бібліяграфічнай прадукцыі: карткавыя, друкаваныя, рукапісныя, несамастойныя выдавецкія формы, электронныя.

Жанры бібліяграфічнай прадукцыі.

Віды бібліяграфічнай прадукцыі па грамадскім прызначэнні, храналагічнай (функцыянальна-мэтавай) прымеце, змястоўных і фармальных прыметах бібліяграфіруемых дакументаў, метадах бібліяграфавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Раздзел II. Бібліяграфічная дзейнасць

*Тэма 6. Бібліяграфічная практыка і пазнанне*

Бібліяграфічная дзейнасць у сістэме відаў чалавечай дзейнасці. Паняцце «бібліяграфічная дзейнасць» у тэрмінасістэме бібліяграфазнаўства, яго генезіс, уяўленне аб ім у канцэпцыях розных аўтараў, тэрміналагічных слоўніках, стандартах. Суадносіны паняццяў «бібліяграфічная дзейнасць» і «бібліяграфія». Сістэмна-дзейнасны падыход да разгляду бібліяграфіі. Бібліяграфічная практыка і пазнанне як асноўныя часткі бібліяграфічнай дзейнасці. Асноўныя рысы бібліяграфічнай практычнай дзейнасці. Бібліяграфічная практычная дзейнасць як аснова бібліяграфічнай навукова-даследчай дзейнасці, бібліяграфічнай вучэбнай дзейнасці і інш. Іх сувязь і ўзаемаўзбагачэнне.

*Тэма 7. Кампанентная структура бібліяграфічнай практычнай дзейнасці*

Суб’ект бібліяграфічнай дзейнасці як асноўны сістэмаўтваральны кампанент. Функцыянальнае прызначэнне суб’екта. Узроўні суб’ектаў бібліяграфічнай практыкі. Бібліёграф-прафесіянал як асноўны суб’ект бібліяграфічнай дзейнасці. Псіхалагічныя якасці, веды, уменні і навыкі бібліёграфа. Прафесійная этыка бібліёграфа. Бібліяграфічныя зносіны.

Мэта як кампанент бібліяграфічнай дзейнасці. Агульныя і прыватныя, знешнія і ўнутраныя, бліжэйшыя і канчатковыя, нарматыўныя і варыятыўныя мэты бібліяграфічнай практычнай дзейнасці.

Аб’ект як кампанент бібліяграфічнай дзейнасці. Дакументы і карыстальнікі як аб’екты бібліяграфічнай практыкі. Пашырэнне ўяўлення аб аб’екце бібліяграфічнай дзейнасці ў ідэаграфічнай і кагнітаграфічнай канцэпцыях бібліяграфіі (інфааб’екты, тэксты). Карыстальнік бібліяграфічнай інфармацыі як аб’ект бібліяграфічнай практыкі. Бібліяграфічныя патрэбнасці, інтарэсы і запыты карыстальнікаў. Асноўныя групы карыстальнікаў бібліяграфічнай інфармацыі.

Працэсы бібліяграфічнай дзейнасці. Эвалюцыя поглядаў на іх наяўнасць і сутнасць. Бібліяграфаванне як працэс стварэння бібліяграфічнай прадукцыі (крыніц бібліяграфічнай інфармацыі), яго ўзаемасувязь з іншымі працэсамі. Бібліяграфічнае абслугоўванне і самаабслугоўванне. Бібліяграфічны пошук як

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

скразны бібліяграфічны працэс. Бібліяграфічнае выкарыстанне як заключны (выніковы) бібліяграфічны працэс.

Сродкі ва ўнутранай структуры бібліяграфічнай дзейнасці. Метады і формы бібліяграфічнай практычнай дзейнасці. Асноўныя каналы давядзення бібліяграфічнай інфармацыі да карыстальнікаў. Сучасныя камп'ютарныя сродкі стварэння, перадачы, пошуку і абмену бібліяграфічнай інфармацыяй. Інтэрнэт-тэхналогіі.

Вынікі бібліяграфічнай практыкі. Адпаведнасць і несупадзенне вынікаў і мэт. Сувязь вынікаў з асноўнымі бібліяграфічнымі працэсамі.

### *Тэма 8. Відавая структура бібліяграфіі*

Від бібліяграфіі і відавая класіфікацыя як навуковая праблема.

Віды бібліяграфіі па арганізацыйна-ведамаснай прымеце (інстытуцыянальныя віды бібліяграфіі). Іх сутнасць, аб'екты, традыцыі, абумоўленасць працэсаў, сродкаў і вынікаў задачамі асобных сацыяльных інстытутаў (бібліятэчная справа, кніжны гандаль і інш.).

Віды бібліяграфіі па аднароднасці ствараемай і распаўсюджваемай бібліяграфічнай прадукцыі (па грамадскім прызначэнні, функцыянальна-мэтавай прымеце, змесце бібліяграфіруемых дакументаў). Агульная і спецыяльная бібліяграфія. Падвіды агульнай і спецыяльнай бібліяграфіі. Віды бібліяграфіі па функцыянальна-мэтавай прымеце. Бягучая, рэтраспектыўная і перспектыўная бібліяграфія, іх спецыфіка, узаемасувязь. Віды бібліяграфіі па змесце бібліяграфіруемых дакументаў. Універсальная і галіновая бібліяграфія, іх спецыфіка, узаемасувязь. Шматгаліновая, тэматычная, комплексная, персанальная, краязнаўчая, краіназнаўчая як разнавіднасці галіновай бібліяграфіі. Бібліяграфія бібліяграфіі як спецыфічны від бібліяграфіі.

Дзейнасныя віды бібліяграфіі. Прафесійная і непрафесійная; вытворчая і спажывецкая і інш.

### *Тэма 9. Каталожная і нацыянальная бібліяграфія як прыярытэтныя кірункі развіцця бібліяграфіі на сучасным этапе*

Каталожная бібліяграфія: азначэнне і спецыфіка ў сістэме агульнай бібліяграфіі. Інтэгратыўныя якасці каталожнай біб-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ліяграфіі і іх рэалізацыя ў практычнай бібліяграфічнай дзейнасці. Рэсурсы і сэрвісы сучаснай каталожнай бібліяграфіі.

Нацыянальная бібліяграфія: азначэнне і спецыфіка ў сістэме агульнай бібліяграфіі. Сутнасць паняццяў «нацыянальная бібліяграфія», «дзяржаўная бібліяграфія», «рэпертуарная бібліяграфія», «нацыянальныя бібліяграфічныя сістэмы». Спецыфіка ўліку дакументнай прадукцыі ў нацыянальнай бібліяграфіі і асаблівасці яе бібліяграфічных рэсурсаў. Сувязь нацыянальнай бібліяграфіі з іншымі відамі бібліяграфічнай дзейнасці.

## Раздзел III. Бібліяграфазнаўства як сістэма навуковых ведаў

*Тэма 10. Структура, змест і метады бібліяграфазнаўства*

Бібліяграфазнаўства як сукупнасць навуковых ведаў аб бібліяграфіі і як бібліяграфазнаўчая навуковая дзейнасць суб'екта, накіраваная на пазнанне структуры і якасцей бібліяграфічнай інфармацыі, заканамернасцей яе функцыянавання ў грамадстве.

*Функцыі бібліяграфазнаўства*: інфармацыйная, тлумачальная, эўрыстычная, прагнозная, сінтэзуючая, кумулятыўная.

*Тэрмінасістэма бібліяграфазнаўства.* Яе распрацоўка і ўдасканаленне ў навуковых працах, тэрміналагічных і тэхналагічных стандартах, слоўніках.

Роля прафесійнага друку ў развіцці бібліяграфазнаўства.

*Структура і змест бібліяграфазнаўства.* Аспектны і аб'ектны кірункі дыферэнцыяцыі бібліяграфазнаўства. Асноўныя раздзелы бібліяграфазнаўства згодна аспектнай дыферэнцыяцыі.

Метадалогія бібліяграфазнаўства. Паняцці «метад», «методыка», «метадалогія». Фарміраванне метадалагічнага раздзела бібліяграфазнаўства. Погляды на метадалогію бібліяграфазнаўства як частку тэорыі бібліяграфіі, самастойны раздзел побач з тэорыяй, гісторыяй, арганізацыяй і тэхналогіяй бібліяграфіі.

Шматузроўневая сістэма метадаў бібліяграфазнаўства. Выкарыстанне філасофскіх, агульнанавуковых і спецыяльных метадаў пры правядзенні бібліяграфічных даследаванняў. Метады сумежных навуковых дысцыплін і іх выкарыстанне пры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

правядзенні бібліяграфічных даследаванняў. Спецыяльныя метады бібліяграфазнаўства. Бібліяметрычны аналіз: яго спецыфіка і значэнне для развіцця бібліяграфічнай дзейнасці і правядзення навуковых даследаванняў. Асноўныя параметры бібліяметрычнага аналізу: тэматычны, відавы, геаграфічны, храналагічны, моўны, інстытуцыянальны, аўтарскі. Кантэнт-аналіз.

Тэорыя бібліяграфіі як адна з фундаментальных дысцыплін сучаснага бібліяграфазнаўства. Яе прадмет, задачы, асноўныя працы. Гісторыя бібліяграфіі: прадмет, задачы, асноўныя працы. Значэнне арганізацыйнага і тэхналагічнага раздзелаў бібліяграфазнаўства як галоўных звёнаў, якія забяспечваюць непасрэдную сувязь паміж бібліяграфічнай навукай і практыкай. Прадмет і задачы «арганізацыі» бібліяграфіі. Тэхналогія і методыка бібліяграфіі. Методыка бібліяграфіі як найбольш старажытны і разгалінаваны раздзел бібліяграфазнаўства, яго прадмет і задачы.

Аб’ектны кірунак дыферэнцыяцыі бібліяграфазнаўства. Бібліяграфічная дзейнасць як найбольш агульны аб’ект бібліяграфазнаўства. Выдзяленне асобных участкаў, вынікаў, працэсаў бібліяграфічнай дзейнасці і фарміраванне дысцыплін і праблем прыватнага бібліяграфазнаўства.

*Тэма 11. Развіццё бібліяграфазнаўства на сучасным этапе*

Дыскусія пачатку 1990-х гг. аб крызісным стане бібліяграфіі, парадыгмах у бібліяграфазнаўстве, метадалогіі бібліяграфазнаўства. В. А. Факееў аб асноўных парадыгмах бібліяграфазнаўства.

Агульная характарыстыка навукова-кнігазнаўчай (пазнавальнай), каштоўнасна-арыенціровачнай (дапаможна-ідэалагічнай), інфармацыйна-камунікатыўнай (дакументаграфічнай), культуралагічнай парадыгм.

Сучасныя канцэпцыі ў бібліяграфазнаўстве. Дакументаграфічная канцэпцыя бібліяграфіі як грамадскай з’явы. А. П. Коршунаў аб метасістэме існавання бібліяграфіі. Асноўныя элементы метасістэмы. Роля бібліяграфічнай інфармацыі.

Кагнітаграфічная канцэпцыя бібліяграфіі як грамадскай з’явы. Метадалагічная аснова канцэпцыі. В. А. Факееў аб метасістэме існавання бібліяграфіі. Уяўленне В. А. Факеева аб бібліяграфіі як сацыякультурным комплексе, які ўключае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліяграфічныя веды (інфармацыю), бібліяграфічны сацыяльны інстытут, бібліяграфічную дзейнасць і бібліяграфічную культуру, так названы ім «бібліяграфічны квадрат». Трохузроўневая структура функцый бібліяграфіі. Асноўныя функцыі бібліяграфіі.

Ідэадакументаграфічная (ідэаграфічная) канцэпцыя бібліяграфіі як грамадскай з'явы. Н. А. Сляднева аб метасістэме існавання бібліяграфіі. Асноўныя элементы метасістэмы. Роля бібліяграфічнай інфармацыі. Функцыі бібліяграфічнай інфармацыі.

Духоўна-вытворчая (кагнітыўна-камунікацыйная) канцэпцыя А. В. Сакалова. Метадалагічная аснова канцэпцыі. Асноўныя задачы і катэгорыі бібліяграфіі. Бібліяграфічныя веды як вядучае паняцце бібліяграфіі. Функцыі бібліяграфіі.

Культуралагічная канцэпцыя бібліяграфіі (М. Г. Вохрышава, Н. Б. Зіноўева, Ю. С. Зубава). Метадалагічная аснова канцэпцыі. Спецыфіка бібліяграфіі ў метасістэме «культура». Асноўная якасць і найбольш істотныя прыметы бібліяграфіі.

Інфармацыйна-ўпраўленчая канцэпцыя А. А. Грачыхіна. Метадалагічная аснова канцэпцыі. Метасістэма бібліяграфіі. Спецыфіка бібліяграфіі як галіны інфармацыйнай дзейнасці, яе асноўнае грамадскае прызначэнне.

Навуказнаўчая канцэпцыя Л. В. Астахавай. Бібліяграфічнае пазнанне. Бібліяграфія як навуковы феномен.

Працэсна-кагнітыўная (кагнітыўна-трансфармацыйная) канцэпцыя В. П. Лявонава. Вядучыя катэгорыі. Бібліяграфічная трансфармацыя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

*1.* Библиотечная энциклопедия / Рос. гос. б-ка. – М. : Пашков дом, 2007. – 1299 с.

*2. Коршунов, О. П.* Библиографоведение : учебник для студентов, обучающихся по направлению подготовки 071900 «Библиотечно-информационная деятельность» (квалификация «бакалавр») / О. П. Коршунов, Н. К. Леликова, Т. Ф. Лиховид ; под общ. ред. О. П. Коршунова. – СПб. : Профессия, 2014. – 287 с. : ил., портр., факсим., табл. – (Бакалавр библиотечно-информационной деятельности / отв. ред. Г. В. Михеева) (Учебник для бакалавров).

*3. Кузьмініч, Т. В.* Бібліяграфазнаўства. Тэорыя : вучэб. дапам. для студэнтаў устаноў выш. адукацыі па спецыяльнасці «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках)» / Т. В. Кузьмініч. – Мінск : Беларусь, 2012. – 215 с.

*4. Кузьмініч, Т. В.* Бібліяграфазнаўства. Тэорыя : вучэб. дапам. для студэнтаў выш. навуч. устаноў па спецыяльнасці 1-23 01 11 «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках)» / Т. В. Кузьмініч. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2011. – 203 с.

*5. Лявончыкаў, В. Е.* Тлумачальны слоўнік бібліятэчных і бібліяграфічных тэрмінаў / В. Е. Лявончыкаў, Л. А. Дзямешка, Р. І. Саматыя. – 3-е выд., выпр. і дап. – Мінск : БДУКМ, 2012. – 231 с.

*6.* Методологические и теоретические проблемы библиографии в контексте новых информационных технологий : [сб. ст.] / Рос. гос. б-ка, НИО библиографии; [сост. С. И. Коровицына]. – М. : Пашков дом, 2007. – 174, [1] с. – (Вопросы библиографоведения ; вып. 16).

*7.* Справочник библиографа / [О. А. Александрова и др. ; науч. ред.: Г. Ф. Гордукалова, Г. В. Михеева]. – 4-е изд., испр. и доп. – СПб. : Профессия, 2014. – 767 с. : ил., табл.

*8. Фокеев, В. А.* Библиографоведение. Информатика : терминологический словарь / В. А. Фокеев. – М. : Литера, 2009. – 474 с. – (Современная библиотека ; вып. 46).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*9. Швецова-Водка, Г. Н.* Классификация электронной библиографической продукции / Г. Н. Швецова-Водка // Теорія, історія, організація та методика бібліографії. – Рівне : ПП ДМ, 2011. – С. 254–268.

*10. Швецова-Водка, Г. Н.* Компьютерная библиография в системе библиографических ресурсов / Г. Н. Швецова-Водка // Теорія, історія, організація та методика бібліографії. – Рівне : ПП ДМ, 2011. – С. 179– 182.

*Дадатковая*

*1. Беспалова, Э. К.* Формирование библиографической мысли в России (до 60-х гг. XIX в.): учеб. пособие / Э. К. Беспалова. – СПб. : Профессия, 2007. – 316, [1] с. – (Библиотека).

*2.* Вопросы библиографоведения : [сб. науч. ст.] / Рос. гос. б-ка, НИО библиографии. – М. : Пашков дом, 2007. – Вып. 16. – 175 с.

3. *Вохрышева, М. Г.* Теория библиографии: учеб. пособие / М. Г. Вохрышева. – Самара : Изд-во СГАКИ, 2004. – 367 с.

*4. Швецова-Водка, Г. Н.* Инфоквант, документ или книга? / Г. Н. Швецова-Водка // Теорія, історія, організація та методика бібліографії. – Рівне : ПП ДМ, 2011. – С. 63–77.

*5. Гречихин, А. А.* Общая библиография: учебник для студентов высш. учеб. заведений, обуч. по направлению книговедение / А. А. Гречихин. – М. : Изд-во МГУП, 2000. – 588 с.

*6. Зиновьева, Н. Б.* Основы современной библиографии : учеб. пособие / Н. Б. Зиновьева. – М. : Либерея-Бибинформ, 2007. – 95 с. – (Серия «Библиотекарь и время. XXI век»; вып. 69).

*7. Костова, Н.* Библиографията в структурата на научната дейност: изследване / Н. Костова. – София : «За буквите – О писменехь», 2010. – 196 с.

*8. Леонов, В. П.* Besame mucho : путешествие в мир книги, библиографии и библиофильства / В. П. Леонов ; Рос. акад. наук, науч. совет «История мировой культуры», б-ка Рос. акад. наук, С.-Петерб. региональная комиссия по истории книжной культуры и комплексному изучению книги. – М. : Наука, 2008. – 268 с. : ил.

*9. Леонов, В. П.* Библиография как профессия / В. П. Леонов. – М. : Наука, 2005. – 124 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*10. Моргенштерн, И. Г.* Информационный и книжный мир. Библиография : (избранное) / И. Г. Моргенштерн. – СПб. : Профессия, 2007. – 439, [1] с. – (Библиотека).

*11. Моргенштерн, И. Г.* Общее библиографоведение : учеб. пособие по специальности 052700 «Библиотечно-информационная деятельность» / И. Г. Моргенштерн ; Челяб. гос. акад. культуры и искусств. – СПб. : Профессия, 2005. – 208 с. – (Серия «Библиотека») (Учебник для вузов).

*12. Новоженова, Т. А.* Методологические основания общей теории библиографии / Т. А. Новоженова; Краснодар. гос. ун-т культуры и искусств. – Краснодар : КГУКИ, 2003. – 308 с.: схемы. – (Культурная жизнь юга России).

*13.* Российское библиографоведение: итоги и перспективы: сб. науч. ст. – М. : ФАИР-ПРЕСС, 2006. – 688 с.

*14. Сляднева, Н. А.* Библиография в системе Универсума человеческой деятельности / Н. А. Сляднева // Библиография. – 1993. – № 1. – С. 33–41.

*15. Сляднева, Н. А.* Библиография в системе Универсума человеческой деятельности: опыт системно-деятельностного анализа / Н. А. Сляднева ; МГУК. – М., 1993. – 225 с.

*16. Соколов, А. В.* Ретроспектива-70: биобиблиографический отчет / Петерб. библиотечное о-во. – СПб., 2004. – С. 125–169.

*17. Фокеев, В. А.* Библиографическая наука и практика: терминологический словарь / В. А. Фокеев. – СПб. : Профессия, 2008. – 269, [1] с.

*18. Фокеев, В. А.* Библиография: теоретико-методологические основания : учеб. пособие для системы дополнительного библиотечно-информационного образования / В. А. Фокеев. – СПб. : Профессия, 2006. – 350 с. – (Библиотека).

*19. Фокеев, В. А.* Отечественное библиографоведение: науч.-практ. пособие / В. А. Фокеев. – М. : Либерия-Бибинформ, 2006. – 184 с.

*20. Фокеев, В. А.* Природа библиографического знания / В. А. Фокеев. – М. : Изд-во Рос. гос. б-ки, 1995. – 351 с.

*21. Якушева, О. В.* Понятие «библиография» в концепциях британских ученых / О. В. Якушева // Библиография. – 1997. – № 2. – С. 136–145.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі

Для дыягностыкі прафесійных кампетэнцый, выяўлення ўзроўню засваення ведаў і ўменняў па вучэбнай дысцыпліне рэкамендаваны наступны інструментарый:

– франтальнае апытанне на лекцыях;
– тэставы кантроль;
– падрыхтоўка электронных прэзентацый;
– напісанне эсэ па асобных тэмах дысцыпліны;
– вуснае апытанне студэнтаў на семінарах па распрацаваных тэмах;
– праверка індывідуальных заданняў, выкананых на практычных работах;
– экзамен.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

У мэтах павышэння эфектыўнасці засваення вучэбнага матэрыялу па вучэбнай дысцыпліне і фарміравання прафесійных кампетэнцый прадугледжана самастойная работа студэнтаў (СРС), якая накіравана на актывізацыю вучэбна-пазнавальнай дзейнасці студэнтаў; фарміраванне ў іх уменняў і навыкаў самастойнага набыцця і абагульнення ведаў; фарміраванне ўменняў і навыкаў самастойнага прымянення ведаў на практыцы; самаразвіццё і самаўдасканаленне.

Студэнты вывучаюць рэкамендаваную літаратуру і выконваюць розныя формы СРС па прапанаваных тэмах. Змест работы павінен паказаць ступень засваення студэнтам асноўных з'яў, фактаў і працэсаў развіцця бібліяграфіі, а таксама яго ўменне самастойна мысліць, аналізаваць і абагульняць вывучаны матэрыял.

## Формы выканання самастойнай работы:

– распрацоўка электроннай прэзентацыі (не менш 12 слайдаў);
– падрыхтоўка эсэ (не менш за 2 старонкі тэксту);
– пісьмовыя адказы на тэсты;
– пісьмовае выкананне індывідуальных заданняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Прыкладныя тэмы для самастойнай работы

1. Бібліяграфія як грамадская з’ява.
2. Формы існавання бібліяграфічнай інфармацыі.
3. Бібліяграфічная практычная дзейнасць: паняцце і структура.
4. Кампанентная структура бібліяграфічнай дзейнасці.
5. Відавая класіфікацыя бібліяграфічнай прадукцыі.
6. Бібліяграфазнаўства як сістэма навуковых ведаў.
7. Развіццё бібліяграфазнаўства на сучасным этапе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**БІБЛІЯГРАФАЗНАЎСТВА. Раздзел 1. ТЭОРЫЯ**

*Тыпавая вучэбная праграма*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2017. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,22. Ул.-выд. арк. 0,81. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ